За правы чалавека

Віцебскі рэгіянальны праваабарончы бюлетэнь

№ 9 (92) Верасень 2014 г.

Вярхоўны суд не абараніў права віцебчукоў на мірныя сходы



Хрыстафор Жаляпаў

Ліст з адмовай абавязаць цэнтральную гарадзкую паліклініку выконваць рашэньне выканкаму, кіраўніцтва якой адмаўляецца заключаць дамовы на абслугоўваньне акцыяў, атрымаў абласны каардынатар руху "За свабоду" Хрыстафор Жаляпаў.

Зьвяртаючыся ў Вярхоўны суд, спадар Жаляпаў чарговы раз спрабаваў вырашыць набалелую віцебскую праблему: раённыя адміністрацыі на працягу ўжо амаль пяці гадоў забараняюць праводзіць любыя акцыі з ініцыятывы мясцовых актывістаў. Спасылаюцца чыноўнікі на рашэньне Віцебскага гарвыканкаму, якое рэглямэнтуе парадак зваротаў па дазвол. Паводле гэтага рашэньня, разам з заяўкай ініцыятары мусяць падаваць дамовы на абслугоўваньне акцыяў супрацоўнікамі ЖКГ, цэнтральнай гарадзкой паліклінікай і міліцыяй. Аднак цэнтральная паліклініка заключыць такую дамову не пагадзілася ні разу, што і станавілася падставай для неаднаразовых забаронаў.

Летась віцебскія актывісты зьвярнуліся ў Кастрычніцкі райсуд, каб такім чынам змусіць кіраўніцтва паліклінікі выконваць прапісаны ў рашэньні гарвыканкаму парадак. Але 15 сакавіка 2013 году суд адмовіўся прыняць рашэньне на карысьць Хрыстафора Жаляпава. Паводле рашэньня суду, змусіць адміністрацыю аховы здароўя да заключэньня дамовы на абслугоўваньне акцыі немагчыма: маўляў, гэтая структура вольная вырашаць, ці хоча яна заключыць дамову, або не. І парадак, прадугледжаны рашэньнем Віцебскага гарвыканкаму №881 "Аб масавых мерапрыемствах у г. Віцебску", такім чынам, абавязковы толькі для заяўнікаў: гэта яны мусяць заключаць дамовы на абслугоўваньне акцыяў. А другі бок, паводле суду, не абавязаны на гэта пагаджацца.

Аспрэчыць рашэньне Кастрычніцкага райсуду не ўдалося ў абласным судзе. А цяпер права на правядзеньне мірных сходаў і публічнае выказваньне не падтрымаў і Вярхоўны суд.

Каардынатар руху "За свабоду" па Віцебскай вобласьці Хрыстафор Жаляпаў падкрэсьлівае, што магчымасьць парушэньня правоў мясцовых жыхароў закладзенае ў самім дакумэнце — тым самым рашэньні гарвыканкаму, якое зьяўляецца невыканальным:

"Выканаць патрабаваньне пра дамовы немагчыма. Супрацоўнічаць з намі пагаджаецца толькі прадпрыемства ЖКГ. Што да цэнтральнай гарадзкой паліклінікі, то яны ня проста адмаўляюцца, а прыдумляюць нейкія сумнеўныя прычыны. Прыкладам, напярэдадні акцыяў да Дня Волі, пасьля забароны якіх мы і зьвярнуліся ў суд, узьнікла імавернасьць успышкі сэзонных захворваньняў. Так нам адказалі з паліклінікі – заявілі, што ў іх чакаецца шмат працы менавіта 25 сакавіка. А ў лісьце зь Вярхоўнага суду дадаецца і яшчэ адно тлумачэньне. Аказваецца, усім вядома, што ў пералік платных паслуг, якія мэдычная ўстанова можа аказваць насельніцтву, абслугоўваньне масавых мерапрыемстваў не ўваходзіць. Дык чаго ж Віцебскі гарвыканкам накіроўвае грамадзян заключаць дамовы, якія супярэчаць заканадаўству – Закону Рэспублікі Беларусь "Аб ахове здароўя"? Там сказана пра платныя паслугі, але ж такой, якую змушаюць замовіць нас, у прыродзе не існуе!"

Віцебскія актывісты неаднаразова патрабавалі, каб невыканальнае рашэньне гарвыканкаму было зьменена. Але заўжды атрымлівалі адмову — са спасылкай на тое, што рашэньне №881 "Аб масавых мерапрыемствах у г.Віцебску" прайшло юрыдычную экспэртызу, і, адпаведна, зьяўляецца бездакорным з пункту гледжаньня заканадаўства.

На ўзор гэтага рашэньня мясцовыя адміністрацыі ў рэгіёнах Віцебшчыны склалі свае, і цяпер ва ўсёй Віцебскай вобласьці правядзеньне масавых акцыяў з ініцыятывы грамадзян зрабілася немагчымым.

Мясцовыя ўлады Віцебску забаранілі пікеты ў падтрымку Украіны


Ян Дзяржаўцаў

Сябры Кансэрватыўна-хрысьціянскай партыі БНФ Ян Дзяржаўцаў, Алег Емяльянаў і Пятро Сарапеня падавалі заяўкі на акцыі ў трох раёнах Віцебску. І з усіх трох раённых адміністрацыяў атрымалі адмовы. Паводле Яна Дзяржаўцава, мэтай меркаваных акцыяў было публічнае асуджэньне агрэсіі Расеі ў дачыненьні да незалежнай сувэрэннай Украіны.

Ян Дзяржаўцаў: “*Пікеты мусілі прайсьці з 22 па 24 верасьня ў месцах, адмыслова вызначаных уладамі для правядзеньня масавых акцыяў. Нам адмовілі на падставе таго, што мы не заключылі дамоваў на абслугоўваньне акцыяў з ЖКГ, мэдыкамі цэнтральнай гарадзкой паліклінікі і міліцыяй. Гэтых дамоў ад нас патрабуюць у адпаведнасьці з рашэньнем Віцебскага гарвыканкаму. Аднак рашэньне гэтае невыканальнае — мэдыкі і міліцыя яшчэ ні разу не пагадзіліся заключыць з намі дамовы. Таму гэтым разам мы вырашылі да іх не зьвяртацца. Што да мясцовых адміністрацыяў, то чыноўнікі прадэманстравалі нам сваё ўласнае стаўленьне да падзеяў ва Ўкраіне — яны адмаўляюць нам у прадстаўленьні гэтай праблемы на шырокае грамадзкае абмеркаваньне*”.

Ян Дзяржаўцаў кажа, што прадстаўнікі КХП БНФ гатовыя чарговы раз ініцыяваць кампанію за зьмены ў рашэньне гарвыканкаму №881 “Аб масавых мерапрыемствах у г. Віцебску". Такіх ініцыятываў было ўжо некалькі, але яны былі беспасьпяховыя: з усіх інстанцый актывістам адказвалі, што рашэньне прайшло юрыдычную экспэртызу, зацьверджанае, а значыць прызнанае дасканалым.

Прыёмная мама з Воршы дамаглася, каб яе адклікалі з фармальнага адпачынку

Прыёмная маці-выхавальніца Сьвятлана Грачуліна дамаглася таго, каб аддзел адукацыі Аршанскага райвыканкаму адклікаў яе з фармальнага адпачынку. У Воршы прайшоў першы ў Беларусі суд па пазове прыёмных бацькоў-выхавальнікаў да мясцовага аддзелу адукацыі, у якім разглядалася немагчымасьць работніка адмовіцца ад працоўнага водпуску.

Сутнасьць канфлікту Сьвятланы Грачулінай і аддзелу адукацыі палягала ў тым, што жанчыну, якая зьяўляецца ня толькі мамай, але і выхавальнікам аддзелу адукацыі, чыноўнікі неаднаразова адпраўлялі ў фармальны адпачынак. Сёлета яе вымушана адправілі ў адпачынак з 28 ліпеня па 21 верасьня, хаця прыёмнае дзіця ўвесь гэты час заставалася зь ёй. У пазове Грачуліна прасіла прызнаць незаконным загад наймальніка аб прадастаўленьні адпачынку, прызнаць, што яна знаходзіцца на працоўным месцы, і абавязаць наймальніка выплаціць за гэты пэрыяд заробак, а не адпускныя.



Гэты суд стаў прэцэдэнтам, і прычынай яму паслужыла сыстэма адносін, якая склалася паміж прыёмнымі бацькамі і чыноўнікамі. Справа ў тым, што ў Беларусі прыёмныя бацькі - гэта ня толькі апекуны дзіцяці-сіраты (гэта значыць фактычна звычайныя бацькі), але і працаўнікі аддзелу адукацыі. Прывязка да мясцовага выканкаму ў выглядзе працоўнай дамовы, лічаць прыёмныя бацькі, робіць іх празьмерна залежнымі ад волі чыноўнікаў.

У судзе Сьвятлана Грачуліна настойвала на тым, што яна ня супраць, каб прыёмнае дзіця было зь ёй, але тады і адпачынак павінен паводле закону застацца нявыкарыстаным. За год нявыкарыстанага адпачынку работніку належыць кампэнсацыя. У выпадку са Сьвятланай гадавая кампэнсацыя - гэта 4,5 мільёны рублёў. Калі ж яе адпраўляюць у адпачынак фармальна, па факце і адпачыць яна не можа, і адначасова губляе прыстойную суму.

Юрыст Алена Кашына, якая займаецца праблемамі прыёмных сем'яў, падкрэсьлівае, што сытуацыя з фармальнымі адпачынкамі актуальная практычна для ўсёй краіны: “Ва ўсёй Беларусі, апроч Магілёўскай вобласьці, прыёмных бацькоў адпраўляюць у неіснуючыя адпачынкі. Толькі адзінкам атрымоўваецца сысьці ў рэальны адпачынак. Тады навошта гэтыя адпачынкі наогул патрэбны? Да мяне са скаргамі на фармалізм зьвяртаюцца прыёмныя бацькі з усёй краіны, аднак да суду справу ніхто даводзіць ня рызыкаваў".

Аддзел адукацыі Аршанскага райвыканкаму яшчэ да паседжаньня настойваў на тым, што наймальнік можа адправіць работніка ў адпачынак і безь яго жаданьня. Пры гэтым фармальным адпачынак Сьвятланы Грачулінай там не лічылі. У дасудовай сустрэчы чыноўнікі адмовіліся ад прапановы суду пайсьці на міравое пагадненьне. Намесьнік начальніка аддзелу адукацыі Аксана Булаўка таксама заяўляла, што пазоў прызнаваць яны не зьбіраюцца.

“Пасьля публікацыі на TUT.BY пазыцыя аддзелу адукацыі зьмянілася. Я нават не чакала. У судзе юрыст аддзелу адукацыі заявіла, што яны прапануюць мне міравое пагадненьне. Прапанавалі, што адклічуць мяне з адпачынку з 1 верасьня. Я пагадзілася, ня стала настойваць, каб прызнавалі нявыкарыстаным увесь адпачынак з 28 ліпеня, бо цалкам віну аддзелу адукацыі суд бы не наважыўся прызнаць. Для мяне важна было, каб аддзел адукацыі проста прызнаў сваю памылку, і ён зрабіў гэта", - сказала Грачуліна, падкрэсьліваючы, што надалей такое рашэньне суду дае ёй права зноў патрабаваць не адпраўляць яе ў адпачынак, калі не атрымаецца ўладкаваць дзіця, напрыклад, у лягер. - І я ўсьцешаная, што мы паказалі шлях астатнім бацькам, што магчыма адмаўляцца ад адпачынку, калі дзеці застаюцца зь імі", - дадала прыёмная маці-выхавальніца.

Віцебскі праваабаронца патрабуе прыцягнуць расейскую газэту да адказнасьці

Праваабаронца Павал Левінаў дамагаецца пачатку адміністрацыйнага працэсу ў дачыненьні да газэты «Аптечка Еламеда». На думку Левінава, выдаўцы і распаўсюджвальнікі газэты, якая зарэгістраваная ў Расеі, павінны быць прыцягнутыя да адміністрацыйнай адказнасьці за яе незаконны выраб і распаўсюд на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.


Павал Левінаў

З адпаведным патрабаваньнем праваабаронца зьвярнуўся ў аддзел унутраных спраў адміністрацыі Першамайскага раёну Віцебску яшчэ на пачатку верасьня бягучага году. І вось надоечы стала вядома: участковы інспэктар АУС адміністрацыі Першамайскага раёну Віцебску старшы лейтэнант міліцыі В. Пагарэльскі пастанавіў — справу аб адміністрацыйным правапарушэньні ў дачыненьні да расейскага выданьня спыніць. Сваё рашэньне Пагарэльскі абгрунтаваў адказам намесьніка Міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь Ігара Лапцёнка ад 16 чэрвеня 2009 г., зь якога вынікае, што адмененая працэдура выдачы дазволаў для распаўсюду расейскіх пэрыядычных выданьняў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

Аднак, як лічыць праваабаронца, участковы інспэктар вынес пастанову, якая не грунтуецца на дзейным заканадаўстве. Свае довады Левінаў строіць на падставе судовых рашэньняў, вынесеных апошнімі гадамі ў дачыненьні да рэдакцыі і супрацоўнікаў газэты « Віцебскі кур'ер», якая таксама зарэгістраваная ў Расеі.

Так, 4 траўня 2010 году судзьдзя суду Першамайскага раёну Віцебску Валянціна Кісьмярошкіна разгледзела справу аб адміністрацыйным правапарушэньні ў дачыненьні да Віктара Рамнёва, якая паступіла ад начальніка АУС адміністрацыі Першамайскага раёну Віцебску. Віцебскі актывіст перавозіў у легкавіку 56 асобнікаў расейскага пэрыядычнага выданьня — газэты «Віцебскі кур'ер» і быў прыцягнуты за гэта да адказнасьці на падставе часткі 2 артыкулу 22.9 Кодэксу аб адміністрацыйных правапарушэньнях.

Судовая пастанова, вынесеная судзьдзёй Кісьмярошкінай, абвяшчала: «Паводле адношаньня Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь ад 20.04.2010 году прадукцыя замежнага сродку масавай інфармацыі можа быць распаўсюджаная ў Рэспубліцы Беларусь на падставе атрыманьня дазволу ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасьці з п.5 арт.17 Закону Рэспублікі Беларусь ад 17.07.2008 году "Аб сродках масавай інфармацыі". У цяперашні час распрацаванае палажэньне аб парадку выдачы дазволу на распаўсюд прадукцыі замежнага сродку масавай інфармацыі».

Згаданая пастанова суду была абскарджаная, і судзьдзя Віцебскага абласнога суду Ірына Смалякова пацьвердзіла законнасьць пастановы судзьдзі Кісьмярошкінай аб прыцягненьні Рамнёва да адміністрацыйнай адказнасьці, адзначыўшы, што «дазволу Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь на распаўсюд на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь газэты "Віцебскі кур'ер", зарэгістраванай на тэрыторыі Расейскай Фэдэрацыі, Рамнёў В.А. ня мае».

Прызнаў справядлівым прыцягненьне Віктара Рамнёва да адміністрацыйнай адказнасьці і намесьнік старшыні Вярхоўнага Суду Валер Калінковіч, паколькі «дазвол Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь на распаўсюд на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь газэты "Віцебскі кур'ер", зарэгістраванай на тэрыторыі Расейскай Федэрацыі Рэмнеў В.А. ня мае, што пацьвярджаецца лістом Міністэрства інфармацыі №03-03/2698 ад 10 лістапада 2010 г.».

Названы факт прыцягненьня распаўсюдніка газэты «Віцебскі кур'ер» не зьяўляецца адзінкавым. У кастрычніку 2012 году судзьдзёй суду Першамайскага раёну Віцебску Натальляй Караблінай за распаўсюд 241 асобніка газэты «Віцебскі кур'ер» быў прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасьці Міхаіл Жураўлёў. Справа Жураўлёва была прынятая ў вытворчасьць па прадстаўленьні начальніка АУС адміністрацыі Першамайскага раёну Віцебску.

У пастанове судзьдзя Карабліна адзначыла: «Газэта "Віцебскі кур'ер" зарэгістраваная на тэрыторыі Расейскай Фэдэрацыі і дазволу Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь на распаўсюд на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь гэтай газэты ня маецца». І касацыйная, і наглядныя судовыя інстанцыі, і нават пракурор гораду Віцебску пацьвердзілі законнасьць адміністрацыйнага пакараньня грамадзяніна Жураўлёва.

На думку Паўла Левінава, факты перасьледу распаўсюджвальнікаў газэты «Віцебскі кур'ер» наўпрост сьведчаць пра яе дыскрымінацыю, а таксама пра выбарачнасьць прымяненьня дзейнага заканадаўства ў дачыненьні да парушальнікаў закону аб СМІ. Бо наконт распаўсюду адных замежных сродкаў масавай інфармацыі (газэта «Віцебскі кур'ер») начальнік АУС адміністрацыі Першамайскага раёну Віцебску згаджаецца з накіраваньнем справы аб адміністрацыйным правапарушэньні ў суд, а ў дачыненьні да другіх (газэта «Аптечка Еламеда») — пры аналягічных прыкметах парушэньня закону — згаджаецца з пастановай пра спыненьне справы.

Пры такіх акалічнасьцях, мяркуе праваабаронца Павал Левінаў, пастанова пра спыненьне справы аб адміністрацыйным правапарушэньні (незаконны распаўсюд газэты «Аптечка Еламеда») падлягае адмене, і справа павінна быць даведзеная да суду.

У Глыбокім жанчына-інвалід змагаецца за працу прыбіральшчыцы

Прыбіральшчыцы з заробкам у 1,3 мільёна могуць не працягнуць кантракт у мясцовай ЖКГ. Аксана ўладкавалася на працу ў мясцовую жыльлёва-камунальную гаспадарку 4 гады таму. Паводле слоў жанчыны, першапачаткова ў яе абавязкі ўваходзіла прыборка пад'ездаў шматпавярховікаў, але ў выніку яе пачалі скіроўваць і ў калгас, і на прыборку гарадзкога сьметніку.

"Аказалася, што і ў калгас трэба, і на гарадзкія сьметнікі, таму што ў ЖКГ ёсьць плян па макулятуры, пластыкавых бутэльках, шклотары... Цэлы дзень на гэтым сьмярдзючым сьметніку ў мароз трэба адкалупацца. Пыталіся ў начальніка, чаму мы павінны, калі я, дапусьцім, уладкоўвалася мыць пад'езды, а не на сьметнік. Яны адказвалі, што калі не падабаецца - звальняйся", - расказвае жанчына.

Аксана мае праблемы са здароўем. Жанчына сьцьвярджае, што па мэдычных паказчыках ёй нельга працаваць у марознае і ветранае надвор'е, ёсьць і адпаведная даведка.

Пазьней Аксане далі трэцюю ступень інваліднасьці, і, паводле слоў жанчыны, кіраўніцтва вырашыла разарваць зь ёй кантракт. Але высьветлілася, што кантракт з Аксанай быў заключаны толькі на першы год працы, на астатнія тры гады ён не працягваўся. Жанчыне прапанавалі падпісаць паперы заднім днём, а пасьля яе адмовы прапанавалі скласьці працоўную дамову:

"Юрыст сказаў: калі не падпішаце працоўную дамову, вы звольненыя, вы працуеце без дакумэнтаў, гэта незаконна. Аддзел кадраў сказаў: няма розьніцы, што паводле кантракту, што паводле дамовы - вы будзеце атрымліваць тую самую зарплату. І вось у мяне ў выніку зарплата зьнізілася на мільён - да мільёна трохсот - мільёна чатырохсот. Я ўзяла крэдыт у банку на рамонт кватэры. Зрабіла рамонт, цяпер павінная выплаціць 39 мільёнаў, і мне трэба з гэтага мільёна трыста жыць, дачцэ дапамагаць і яшчэ крэдыт выплачваць".

Кіраўнік Аксаны Віктар Філіпенка тлумачыць, што пакуль звальняць жанчыну ніхто не зьбіраецца, але да яе ёсьць прэтэнзіі ў кіраўніцтва: *"Я ўжо зрабіў запыт у шпіталь, яна павінная прайсьці камісію. Там жа далі рэкамэндацыю, што можа працаваць бухгальтарам, кастэлянкай, гардэробшчыцай, але ў нас такой працы няма".*

Сама жанчына з прэтэнзіямі кіраўніка ня згодная, таму зьбіраецца падаваць скаргу ў камісію па працоўных спрэчках.

Улады забаранілі сьвяткаваньне 500-годзьдзя бітвы пад Воршай

Аршанскі райвыканкам забараніў правядзеньне 6 верасьня на Крапівенскім полі фэсту і канцэрту. Пра гэта гаворыцца ў афіцыйным адказе з Аршанскага райвыканкаму, які атрымаў намесьнік старшыні аргкамітэту па сьвяткаваньні 500-годзьдзя бітвы пад Воршай мастак Мікола Купава. Паводле Купавы, адмова грунтуецца нібыта на няправільна аформленай заяўцы, бо не былі пазначаныя крыніцы фінансаваньня імпрэзы, таксама ня ўключанае забесьпячэньне «хуткай дапамогі».


Мікола Купава

Спадар Купава пракамэнтаваў гэта наступным чынам: *«Калі мы дасылалі заяўку, вялікай надзеі на станоўчы адказ і не было. Але калі б аршанскія ўлады захацелі абысьціся з намі палюдзку і па-людзку ставіліся да беларускай гісторыі, яны напісалі б нам, што яшчэ трэба зрабіць, каб атрымаць дазвол. Аднак яны вырашылі інакш: пасьля нашага звароту да іх прайшоў амаль месяц, яны маўчалі, а за 5 дзён да мерапрыемства даслалі ліст з забаронай».*

Паводле аргкамітэту, ва ўрачыстых імпрэзах на Крапівенскім полі, дзе 8 верасьня 1514 году адбылася бітва, былі гатовыя ўзяць удзел некалькі сотань чалавек, у тым ліку запрошаныя прадстаўнікі замежных амбасадаў. На 6 верасьня заплянавалі набажэнства, экскурсію па Воршы і паездку на Крапівенскае поле. На тым месцы, дзе войска ВКЛ 500 гадоў таму перамагло ўтрая большае войска Маскоўскага княства, мела адбыцца ўскладаньне кветак да памятнага знаку, усталяванага дэмакратычнымі актывістамі, урачыстая частка і канцэрт. Паводле заяўкі ў Аршанскі райвыканкам, усе гэтыя імпрэзы мелі скончыцца да 19 гадзіны.

З-за забароны мерапрыемства ўладамі аргкамітэт мусіў разгледзець іншыя магчымасьці адзначыць угодкі перамогі беларускага войска на чале зь вялікім гетманам Вялікага Княства Літоўскага Канстантынам Астроскім над войскам Вялікага Княства Маскоўскага на рацэ Крапіўне пад Воршай.

Славутая Аршанская бітва адбылася 8 верасьня 1514 году. Амаль 20 гадоў у тых мясьцінах зьбіраюцца ахвотныя згадаць пра гэтую значную гістарычную падзею.

Бюлетэнь "За правы чалавека" выдаецца праваабаронцамі Віцебскага рэгіёну.
Наклад 299 асобнікаў.
Пры падрыхтоўцы бюлетэня выкарыстоўваліся матэрыялы сайта http://prava.vitebsk.cc і іншыя Інтэрнэт-рэсурсы.